послужили развитию новой разновидности музыки – органному рок-исполнительству на уникальном инструменте органе Хаммонда.

1. *Brown, M.* Ethel Smith: Weird Organ Lady or Mondo Organista? [Electronic resource] / M. Brown, E. Galand. – Mode of access: http://theatreorgans.com/hammond/ethel/esmith.asp. – Date of access: 04.09.2022.

2. Hammond organ. Owner's playing guide [Electronic resource]. – Mode of access: https://hammondorganco.com/wp-content/uploads/2011/03/NewB3.pdf. – Date of access: 14.09.2022.

УДК 130.2+008

***А. І. Смолік,***
*доктар культуралогіі, прафесар, загадчык кафедры культуралогіі установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», г. Мінск, Беларусь*

## КУЛЬТУРА ЯК САМААРГАНІЗУЮЧАЯСЯ СІСТЭМА: СІНЕРГЕТЫЧНЫ АСПЕКТ

**Анатацыя.** У артыкуле з пазіцый тэорыі сінергетыкі разглядаецца месца культуры сярод прыродных і сацыяльных сістэм. Акцэнтуецца ўвага на яе характарыстыцы, адрозненнях ад іншых сістэм. Адзначаецца, што па характары ўнутраных сувязей элементаў культуру як сацыяльную сістэму можна трактаваць шматзначна: адкрытая, складаная, нелінейная, нераўнавесная і інш. У артыкуле робіцца выснова, што культура пад уздзеяннем унутраных і знешніх дэтэрмінант з'яўляецца сістэмай, якая самаарганізуецца і самаразвіваецца.

**Ключавыя словы:** дыскурс, культура, самаарганізацыя, сінергетыка, сістэма, развіццё, тэорыя, эмерджэнтнасць.

***A. Smolik,***
*Doctor of Cultural Studies, Professor, Head of the Department of Cultural Studies of the Educational Institution "The Belarusian State University of Culture and Arts", Minsk, Belarus*

## CULTURE AS A SELF-ORGANIZING SYSTEM: SYNERGETIC ASPECT

**Abstract.** The article considers the place of culture among natural and social systems from the standpoint of the theory of senergetics. Attention is focused on its characteristics, features from other systems. It is noted that by

the nature of the internal connections of the elements, culture as a social system can be interpreted meaningfully: open, complex, nonlinear, non-equilibrium, etc. The article concludes that culture under the influence of internal and external determinants is a self-organizing and self-developing system.

**Keywords:** discourse, culture, self-organization, senergetics, system, development, theory, emergence.

Сінергетычная парадыгма як метадалогія навуковага пазнання сёння шырока выкарыстоўваецца не толькі пры вывучэнні прыродазнаўчых праблем, але і ў гуманітарных даследаваннях, у тым ліку ў фундаментальнай культуралогіі. Заснавальнікамі тэорыі сінергетыкі з'яўляюцца нямецкі навуковец Г. Хакен і бельгійскі даследчык хімічных працэсаў І. Прыгожын [3]. Адпаведна іх канцэпцыі, кожная складаная, нелінейная, адкрытая і нераўнавесная сістэма, з аднаго боку, можа паступова развівацца з прадказуемымі вынікамі, а з другога – праз скачок, які пераводзіць сістэму ў якасна новы стан. У выніку біфуркацыі адбываецца ўтварэнне мноства напрамкаў развіцця сістэмы. Пры гэтым прадказаць, які варыянт развіцця будзе найбольш верагодным, немагчыма, таму што выбар варыянта развіцця адбываецца выпадкова падчас скачка пад уплывам унутраных і знешніх фактараў.

У гуманітарным дыскурсе сістэма інтэрпрэтуецца як «аб'яднанне пэўнай разнастайнасці ў адзінае і дакладна расчлянёнае цэлае, элементы якога ў адносінах да цэлага і іншых частак займаюць адпавядаючае ім месца» [4, с. 741]. Па характары ўнутраных сувязей сістэмы падраздзяляюцца на іерархічныя і гарызантальныя. У сістэмах іерархічных, як правіла, маюцца пэўныя вядучыя элементы. У гарызантальных сістэмах усе элементы раўназначныя. Акрамя таго, сярод сацыяльных сістэм вылучаюцца адкрытыя і закрытыя, лінейныя і нелінейныя, простыя і складаныя і інш.

Культура трактуецца як цэласная і саманастраіваючаяся сістэма матэрыяльных і духоўных элементаў. Яна адносіцца да найбольш складаных, пастаянна развіваючыхся і адкрытых сістэм. Галоўная асаблівасць яе як сістэмы, на погляд Э. С. Маркаряна, заключаецца ў тым, што элементы культуры звязаны паміж сабой пэўным чынам, што прыдае сістэме структуру і структурнасць [3]. Менавіта структура і вызначае змяненне

культуры, якая мае шэраг уласцівасцей. Найбольш важнымі з іх, па меркаванні А. Б. Агошкавай, з’яўляюцца наступныя: а) культура здольна да змен і развіцця; б) змены ўласцівасцей элементаў выклікаюць змяненні ўласцівасцей сістэмы і наадварот; в) развіццё культуры адбываецца пад уплывам знешніх і ўнутраных супярэчнасцей і выражаюцца ў зменах структуры і ўласцівасцей сістэмы; в) развіццё культуры магчыма толькі тады, калі ў ёй назапашваецца і структуруецца інфармацыя [1].

Такім чынам, культура з’яўляецца складанай сістэмай, якая самаарганізуецца і гістарычна развіваецца. З характару сістэмнай складанасці культуры вынікае, што яна праяўляе прыкметы як устойлівасці (раўнавагі), так і зменлівасці. Па характары дынамічных паводзін культура адносіцца да нелінейных сістэм. У адрозненне ад лінейных сістэм, у культуры адсутнічае рэакцыя на знешняе ўздзеянне прапарцыянальна маштабам і інтэнсіўнасці гэтага ўздзеяння. Адсутнасць такой залежнасці прыводзіць да парадаксальнага, амаль непрадказальнага характару развіцця культуры, што сведчыць аб здольнасці культуры спантанна змяняцца.

Важнейшай уласцівасцю культуры як нелінейнай, нераўнавеснай сістэмы з’яўляецца яе самаарганізацыя, пад якой падразумяваецца пераход культуры пад уздзеяннем унутраных і знешніх фактараў ад нізкага ўзроўню парадку і арганізацыі да больш высокага ўзроўню структурнасці, арганізаванасці і парадку, адным словам, ад хаосу да парадку. Расійскі культуролаг А. М. Кучынаў лічыць, што да шэрагу ўласцівасцей культуры як іерархічнай сістэмы неабходна далучыць такую яе ўласцівасць, як эмерджэнтнасць, гэта значыць здольнасць культуры набываць прынцыпова новыя якасці пры розных спалучэннях і суадносінах элементаў культуры ці змен унутраных і знешніх умоў, у якіх функцыянуе культура. Пры гэтым, адзначае даследчык, асаблівая роля належыць суб’ектыўнаму фактару [2].

Суб’ект культуры знаходзіцца ў прынцыпова іншай сітуацыі. У культуры ў якасці элементаў і механізмаў суб’ектнасці выступаюць не масавыя прылады працы і працоўныя навыкі, а індывідуальны творчы талент. Асаблівую ролю пры гэтым маюць здольнасці суб’екта да крэатыўных дзеянняў, таму што ён асацыіруецца перш за ўсё з актыўна-дзейнасным пачаткам.

Акрамя таго, пры вызначэнні асаблівасцей суб'ектнасці культуры неабходна ўлічваць яго здольнасць канстытуяваць уласную персанальную ідэнтычнасць і выражаць яе ў творчых формах. Маючы на ўвазе, што культура з'яўляецца інфармацыйна-семіятычнай сістэмай, яе суб'ект павінен таксама мець здольнасць да сацыякультурнай камунікацыі, якая выступае як важнейшы базавы механізм і неад'емная частка культурнага працэсу. З яе дапамогай адбываецца назапашванне, структураванне, захаванне і перадача ад пакалення да пакалення праграм быцця чалавека і яго працэсаў, якія ўяўляюць сабой сукупнасць абарачальных і неабарачальных, паслядоўных у часе змяненняў нераўнавеснай сістэмы. Разнастайнасць працэсаў у культуры практычна невычарпальная і яны развіваюцца дзякуючы назапашванню і структураванню інфармацыі.

Такім чынам, інфармацыйна-семіятычная тэорыя непасрэдна суадносіцца з сінергетычным падыходам, раскрываючы новыя грані культуры як няўстойлівай сістэмы, здольнай да самаарганізацыі.


*1. Агошкова, Е. Б.* Категория «система» в современном мышлении / Е. Б. Агошкова // Вопросы философии. – 2009. – № 4. – С. 57–72.

*2. Кучинов, А. М.* Теория морфогенеза М. Арчер / А. М. Кучинов // Политический вектор. – 2014. – № 2. – С. 70–91.

*3. Маркарян, Э. С.* Культура как способ социальной самоорганизации / Э. С. Маркарян // Мир культуры и культурология. – Вып. 1. – СПб., 2011. – С. 79–91.

*4.* Система // Большой энциклопедический словарь: философия, социология, религия, эзотеризм, политэкономия / гл. науч. ред. и сост. С. Ю. Солодовников. – Минск, 2002. – С. 741–742.